УДК 821.161.3

# ЖАНРАВА-СТЫЛЁВЫЯ АСАБЛІВАСЦІ ТВОРЧАСЦІ СТАНІСЛАВА ШУШКЕВІЧА ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ І АСАБЛІВАСЦІ ЯЕ ВЫВУЧЭННЯ

**Шарапава Алена Васільеўна**
старшы выкладчык кафедры "Беларуская, руская і замежныя мовы"
дзяржаўнай установы вышэйшай прафесійнай адукацыі
"Беларуска-Расійскі ўніверсітэт"
(г. Магілёў, Беларусь)

Адукацыйны стандарт Рэспублікі Беларусь па спецыяльнасці *1-01 01 01 Дашкольная адукацыя* арыентуе выкладчыка на фарміраванне цэлага шэрагу кампетэнцый пры вывучэнні дысцыпліны "Сусветная і айчынная дзіцячая літаратура". У такім кантэксце важным элементам педагагічнай стратэгіі з'яўляецца вывучэнне літаратурнай спадчыны Станіслава Шушкевіча. На гэта тыпавой вучэбнай праграмай (ТД-А.256/ тып.) адводзіцца дзве аўдыторныя гадзіны: адна лекцыйная і адна практычная. Найлепшаму асэнсаванню творчасці пісьменніка спрыяюць таксама і заданні для самастойнай работы, што прапануюцца студэнтам з самага пачатку вывучэння дысцыпліны. Такім чынам, усе пытанні і заданні па тэме могуць быць умоўна падзелены на тры блокі: 1) для лекцыі; 2) для практычных заняткаў; 3) для самастойнай работы.

Адзначым, што вывучэнне дысцыпліны "Сусветная і айчынная дзіцячая літаратура" праводзіцца па жанравым прынцыпе. Зыходзячы з гэтага, студэнты пры вывучэнні тэмы "Станіслаў Шушкевіч" мусяць апеляваць такімі паняццямі, як "літаратурны род", "эпас", "літаратурны жанр", "верш", "апавяданне", "літаратурная казка" і інш.

Першы блок прадугледжвае знаёмства з такімі пытаннямі: *1. Звесткі з біяграфіі Станіслава Шушкевіча (1908 – 1991). Супрацоўніцтва з часопісам "Іскры Ільіча". 2. Тэма Вялікай Айчыннай вайны ў творчасці С. Шушкевіча (вершы "Гара Марата Казея", "Сніўся сон перад паходам", "Дазнанне", "Апавяданні пра Марата Казея").*

Пры асэнсаванні першага пытання студэнты, слухаючы выкладчыка, запаўняюць на лекцыі стандартныя формы храналагічных табліц[1], пры гэтым абавязкова пазначыць неабходна наступныя даты: 19 лютага 1908 г., 1924 г., 1929 г., 1931 − 1934 гг., 1934 г., 1936 г., 1946 г., 1949 г., 1956 г., 1958 – 1970 гг., 1975 г., 1 лютага 1991 г. У слупку ЗАЎВАГІ мэтазгодна будзе запісаць, якія факты асабістай біяграфіі ці гісторыі краіны асабліва паўплывалі на стварэнне таго ці іншага твора С. Шушкевіча. Важна таксама ахарактарызаваць

[1]

| ДАТА | ФАКТЫ ЖЫЦЦЯ І ТВОРЧАСЦІ | ЗАЎВАГІ |
|---|---|---|



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

супрацоўніцтва пісьменніка з часопісам для дзяцей "Іскры Ільіча", даць даведку пра гэты найстарэйшы ў Беларусі часопіс для падлеткаў, які меў пры заснаванні назву "Беларускі піянер", а зараз вядомы як "Бярозка".

Другое пытанне прысвечана адной з канцэпцыйных тэм у айчыннай літаратуры. Выкладчык на лекцыі павінен паказаць, у чым арыгінальнасць аўтарскай трактоўкі тэмы Вялікай Айчыннай вайны. Пісьменнік адлюстроўвае не толькі трагедыю беларускага народа, ён звяртаецца да асэнсавання праблемы "дзіця і вайна". Скразны вобраз тэкстаў Шушкевіча на тэму вайны − вобраз піянера-героя Марата Казея, пра яго аўтар пісаў вершы, апавяданні і аповесць. Важна паказаць навучэнцам абсалютную рэалістычнасць вобраза, адсутнасць пафаснасці пры адлюстраванні падзей. Падобныя творы маюць вялікі выхаваўчы патэнцыял і могуць паспрыяць развіццю цікавасці студэнтаў да названай вышэй праблемы. У сувязі з гэтым можна прапанаваць заданне высокага (прадуктыўнага творчага) узроўню: падрыхтаваць паведамленні пра юных герояў вайны, пра тое, як ушаноўваецца іх памяць зараз. Для навучэнцаў Магілёва актуальна будзе ўзгадаць, напрыклад, Таню Карпінскую.

На практычных занятках студэнтам прапануюцца наступныя пытанні для вывучэння і абмеркавання, а таксама практыкаванні да іх.

*1. Жанр літаратурнай казкі ў творчасці С. Шушкевіча. "Звярыны баль", "Камар-брынкун і Жаба-квакуха", "Пра Лісу-хітруху і добрых сяброў Мядзведзя, Зайца і Пеўніка", "Ліса-хітруха", "У каго найлепш у хаце", "Едзе страшная Яга", "Ліса з магнітафонам", "За што Зязюля з Дзятлікам пасварыліся", "Як Зайчык бабулю шукаў" і інш.*

Практыкаванне 1. Прачытаць тэксты. Узнавіць па "Слоўніку літаратуразнаўчых тэрмінаў", які студэнты самастойна вядуць з першага дня вывучэння дысцыпліны, азначэнне літаратурнай казкі і два асноўныя шляхі яе фарміравання: па-першае, на аснове арыгінальнай аўтарскай фабулы, па-другое, на аснове традыцыйнай фальклорнай фабулы.

Практыкаванне 2. З мэтай класіфікацыі значнай колькасці казак пісьменніка запоўніць прапанаваную табліцу:

| Назва казкі і дата яе напісання (публікацыі) | Шляхі фарміравання казкі (вызначыць па магчымасці) | Алегарычны сэнс вобразаў і сітуацый казкі | Народныя казкі з падобнымі вобразамі і (або) сітуацыямі | Выхаваўча-пазнавальны патэнцыял казкі |
|---|---|---|---|---|

Практыкаванне 3. Размеркаваўшыся на міні-групы, выбраць адну з казак і прыдумаць для яе новы фінал. Напрыклад, у казцы "Ліса з магнітафонам" Барсук вызваліў для Лісы сваю хату і…, у казцы "Як Зайчык бабулю шукаў" Зайчык у пошуках сваёй бабулі трапіў ў Магілёў і…, у казцы "Едзе страшная Яга" Ягу за парушэнне ПДР спынілі супрацоўнікі ДАІ і … і інш.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. Кулешова

*2. Паэтызацыя прыроды, харaства навакольнага свету ў вершах С. Шушкевіча "Дожджык", "Лістапад", "Лівень", "Жнівень", "Восень", "За платамі на градзе", "Вясновы капяжы", "Снежны дзед", "Зазімак", "Свет вясну вітае", "Дзеці і зіма", "Дванаццаць пасланцоў" і інш.*

Практыкаванне 1. Прачытаць вершы. Размеркаваць іх на чатыры тэматычныя групы ў адпаведнасці з порамі году.

Практыкаванне 2. Вызначыць у вершах прыклады разнастайных сродкаў мастацкай выразнасці (тропы і стылістычныя фігуры), найбольш цікавыя з іх занатаваць у сшытак для самастойнай работы.

Практыкаванне 3. Размеркаваўшыся на міні-групы, на аснове верша "Дванаццаць пасланцоў" падрыхтаваць макет маляванкі, у якой тлумачылася б паходжанне назваў месяцаў.

*3. Маральна-этычная праблематыка вершаў С. Шушкевіча "Танцавалі ў сшытку кляксы", "Дзе ж той Лёня?", "Рыгорка-экскурсавод", "Крыкліўцы", "Мурашнік", "Дружны клас" і інш.*

Практыкаванне 1. Прачытаць вершы. Размеркаваць іх на дзве групы: 1) вершы, у якіх адлюстраваны вобразы дзяцей ("Дружны клас", "Непамыцька – хлопчык Віцька" і інш.), 2) вершы, у якіх адлюстраваны алегарычныя вобразы са свету прыроды ("Пчала і кветка", "Трутні" і інш.).

Практыкаванне 2. Для замацавання ведання зместу вершаў супаставіць назву твора з рысай характару, якая ў ім ухваляецца або асуджаецца. Вывады запісаць ў выглядзе камбінацыі лічбаў і літар, пачынаючы з 1[1]: 1) акуратнасць, 2) дысцыплінаванасць, 3) сумленнасць, 4) сціпласць, 5) працавітасць, 6) паважлівыя адносіны да старэйшых, 7) уважлівае стаўленне да сяброў, 8) паслухмянасць, 9) ганарлівасць, 10) гультайства, 11) хітрасць / а) "Танцавалі ў сшытку кляксы", б) "Дзе ж той Лёня?", в) "Рыгорка-экскурсавод", г) "Непамыцька – хлопчык Віцька", д) "Крыкліўцы", е) "Працавітыя швачкі", ё) "Мурашнік", ж) "Дружны клас", з) "Казёл на верталёце", і) "Казка-быль пра рэпку", к) "Пайшоў коўзацца каток", л) "Камарык", м) "Хрыпаты пеўнік", н) "Свавольнікі" і інш.

Самастойная работа студэнтаў выконваецца па наступным алгарытме: выкананне практыкаванняў, пісьмовае іх афармленне ў сшытку для самастойнай работы, праверка выкладчыкам гэтых практыкаванняў (франтальная або выбарачная). Неабходна адзначыць, што змест самастойнай работы вядомы студэнтам ужо з самых першых этапаў вывучэння дысцыпліны. Па тэме "Станіслаў Шушкевіч" прапануюцца наступныя практыкаванні.

1. Падрыхтаваць электронныя прэзентацыі зборнікаў паэта ("Звярыны баль" (1936), "Лясная калыханка" (1958), "Сарочы церамок" (1959), "Мы на змену ідзём" (1961), "Будзільнік" (1966), "Вясёлыя дзятлікі" (1970), "Колькі

[1] З адной лічбай можна спалучыць некалькі літар.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

кіпцікаў у кошкі” (1972), “Дванаццаць пасланцоў” (1973), “Барадаты камар”, “Красавік” (абедзве – 1977), “Ліса з магнітафонам” (1979), “Казачны церам” (1983), “Едзе страшная Яга” (1985), “Казёл на верталёце” (1987), “Непаседлівыя вавёркі” (1993)) па наступным алгарытме: 1) назва зборніка, дата першага выдання, 2) фота вокладкі і паасобных старонак, 3) змест зборніка, 4) жанравыя групы твораў, 5) тэматычныя групы твораў, 6) прыклады найбольш паказальных тэкстаў.

2. Арганізаваць адкрытае спаборніцтва інсцэніровак найбольш прыдатных для гэтай мэты вершаў С. Шушкевіча, напрыклад, “Лясная вечарынка”, “Колькі кіпцікаў у кошкі”, “Дванаццаць пасланцоў”, “Грыбнікі”, “Гыля, гыля, гусачкі”, “Не былі мы ў Афрыцы” і інш., вынікі якога могуць быць зняты на відэа і размешчаны ў сацыяльным сеціве для адкрытага галасавання.

3. Прыдумаць разнапланавыя гульні на аснове некаторых вершаў С. Шушкевіча, напрыклад, інтэлектуальныя гульні на веданне грыбоў (верш “Грыбнікі”), месяцаў года (“Дванаццаць пасланцоў”) і інш.

4. Зрабіць у сшытку тэзісны канспект наступнага артыкула: Жыбуль, В. Ю. Станіслаў Шушкевіч і руская дзіцячая паэзія / В. Ю. Жыбуль // Роднае слова. − 2008. − № 2. − С. 17–20.

Для праверкі ведаў навучэнцаў па творчасці С. Шушкевіча мэтазгодна выкарыстаць комплекс тэставых заданняў, у якіх на адно пытанне даецца чатыры варыянты адказаў, і неабходна выбраць адзін − правільны − адказ.

| | |
|---|---|
| 1. Вызначце гады жыцця Станіслава Шушкевіча<br>– 1882 − 1956; – 1930 − 1984; – 1901 − 1988; **+ 1908 – 1991** | 16. У вершы С. Шушкевіча “Футбол” футбалістамі з’яўляюцца<br>– спартсмены; – школьнікі; – коні; **+ конікі** |
| 2. На пачатку сваёй творчай дзейнасці С. Шушкевіч супрацоўнічаў з часопісам “Беларускі піянер” (“Іскры Ільіча”). Сёння ён мае назву<br>– “Вясёлка”; **+ “Бярозка”**; – “Пяршацвет”; – “Маладосць” | 17. Які сродак мастацкай выразнасці выкарыстаны ў фрагменце “Біў барсук заўзята ў бубен” (верш С. Шушкевіча “Лясная вечарынка”)?<br>**+ алітарацыя**; – параўнанне;– літота; – эліпсіс |
| 3. На якім факультэце вучыўся С. Шушкевіч у Мінскім вышэйшым педагагічным інстытуце?<br>– філалагічным; **+ літаратурным**; – педагагічным; – гістарычным | 18. У вершы С. Шушкевіча “Цяцерына вячэра” гаспадыня не паклікала ў госці<br>– мядзведзя; **+ ваўка**; – лісу; – барсука |
| 4. Які са зборнікаў не належыць пяру С. Шушкевіча?<br>– “Вясёлыя дзятлікі” ; – “Апавяданні пра Марата Казея” ; – “Казачны церам” ; **+ “Пялёсткі”** | 19. Чаму ахрып пеўнік у вершы С. Шушкевіча “Хрыпаты пеўнік”?<br>– сарваў горла ад крыку; – у яго муціраваў голас; **+ бегаў босы па лужах і занядужыў**; – дзельнічаў у конкурсе на лепшага спевака |



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

| | |
|---|---|
| 5. У казцы С. Шушкевіча “Ліса з магнітафонам” Ліса хацела выгнаць з хаты<br>– Мядзведзя; – Воўка; **+ Барсука**; – Вавёрку | 20. Ад якой небяспекі засцерагае чытачоў верш С. Шушкевіча “Пайшоў коўзацца каток”?<br>**+ праваліцца пад лёд**; – разбіцца аб лёд; − застудзіцца на холадзе; – адмарозіць канечнасці |
| 6. У казцы С. Шушкевіча “Звярыны баль” была адлюстравана праблемная сітуацыя, да падобнай пісьменнік звярнуўся праз некалькі дзесяцігоддзяў у казцы<br>– “Пра Лісу-хітруху і добрых сяброў Мядзведзя, Зайца і Пеўніка”; – “За што Зязюля з Дзятлікам пасварыліся”; **+ “Камар-брынкун і Жаба-квакуха”**; – “Як Зайчык бабулю шукаў” | 21. У вершы С. Шушкевіча “Непаседлівыя вавёркі” вавёркі для лепшага сну сваіх дзетак<br>– зрабілі для ваверчанят асобнае дупло; – выключылі святло; – выгналі шумных гасцей; **+ павесілі шторы** |
| 7. У казцы С. Шушкевіча “У каго найлепш у хаце” лясныя жыхары вылучаюць як найлепшую хату<br>– бярлогу мядзеведзя; – нару лісы; **+ дупло вавёркі**; − гняздо цецерука | 22. У вершы С. Шушкевіча “Кухаркі” дзве сястрычкі варылі кашу. Суаднясіце назву кашы і што з ёй здарылася<br>− рысавая каша выкіпела; − аўсяную кашу аддалі суседзям; **+ манная каша падгарэла**; − грэчневую кашу з’елі |
| 8. У якім горадзе ў казцы С. Шушкевіча “Як Зайчык бабулю шукаў” ідзе пошук бабулі?<br>**+ у Мінску**; − у Пінску; − у Магілёве; − у Гомелі | 23. У вершы С. Шушкевіча “Школьны агарод” класы працуюць на сваіх участках. Хто робіць гэту працу лепш за ўсіх?<br>**+ малодшыя класы**; − сярэднія класы; − старшыя класы; − лепш за ўсіх працуюць настаўнікі |
| 9. Жанр, з якога пачаў сваю творчую дзейнасць С. Шушкевіч і да якога звяраўся на працягу ўсяго жыцця − гэта<br>– верш; – балада; **+ казка**; – апавяданне | 24. У вершы С. Шушкевіча “Колькі кіцікаў у кошкі” дзяўчынка налічыла<br>− 1 хвосцік; **+ 5 драпінačак**; − 4 лапкі; − 2 вушкі |
| 10. Узнавіце назву верша С. Шушкевіча “Непамыцька − хлопчык …<br>– Міцька; **+ Віцька**; – Пецька; − Санька | 25. Які асноўны патэнцыял вершаў С. Шушкевіча “Росы”, “Пчала і кветка”, “Цяцерына вячэра”?<br>– мнематычны; **+ выхаваўчы**; – эмоцыеставальны; – пазнавальны |
| 11. Рыгорка ў вершы С. Шушкевіча “Рыгорка-экскурсавод” праводзіць экскурсію па<br>– планетарыі; – заалагічным садзе; **+ батанічным садзе**; – акеанарыуме | 26. Якая асноўная тэма вершаў С. Шушкевіча “На катку”, “Завіруха снежная, не вей”, “Снежны дзед”, “Страшны дзед”?<br>– гістарычная; **+ прыродазнаўчая**; – тапанімічная; – філасофская |



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

| | |
|---|---|
| 12. У вершы С. Шушкевіча "Крыклівыцы" глухі сусед міжволі ўзгадвае?<br>**+ бамбёжку**; – артабстрэл; – канонаду; – выбух снарада | 27. Якая асноўная тэма вершаў С. Шушкевіча "Восень", "Лістапад"<br>– гістарычная; – тапанімічная; – грамадзянская; **+ прыродазнаўчая** |
| 13. У вершы С. Шушкевіча "Дзе ж той Лёня?" без хлопчыка плачуць<br>– дванаццаць пасланцоў; **+ сшыткі-абарванцы і шчарбатая лінейка**; – Лёня і Галя; – бабуля з дзядулем | 28. Якая з пералічаных ніжэй кніг С. Шушкевіча адносіцца да публіцыстыкі?<br>– "Лясная калыханка"; – "Выбранае";<br>**+ "Вяртанне ў маладосць"**; – "Рэха маладосці" |
| 14. Як завуць персанажаў верша С. Шушкевіча "Браты-абібокі"?<br>**+ Пазяхай, Пачакай, Уздыхай, Пачашыпатыліцы**; – Мішка, Грышка і Шчыпай; − дзед Аяяй і бабка Оеёй; – цётка Лянота і яе служкі Двойкі і Адзінкі | 29. Да якога роду ці міжродавага ўтварэння адносяцца творы С. Шушкевіча "Сніўся сон перад паходам", "Дзе быў, разведчык, ноч і дзень?", "Гара Марата Казея", "Шынель Марата Казея"?<br>**+ да лірыкі**; – да эпасу; – да ліра-эпасу; – да драматургіі |
| 15. У вершы С. Шушкевіча "Казка-быль пра рэпку" вырасцілі рэпку памерам з<br>– гарбуз; – яблык; **+ вішню**; – сунічку | 30. Пра якога піянера-героя С. Шушкевіч напісаў цэлы зборнік апавяданняў (1968, 1988)?<br>– пра Лёню Голікава; **+ пра Марата Казея**; − пра Валю Коціка; − пра Зіну Партнову |

Такім чынам, прапанаваная сістэма вывучэння тэмы "Станіслаў Шушкевіч" з улікам жанравай спецыфікі тэкстаў спрыяе фарміраванню ў будучага спецыяліста належных кампетэнцый, садзейнічае найбольш поўнаму выяўленню здольнасцяў навучэнцаў, а таксама своечасоваму правядзенню папераджальных і карэкціруючых дзеянняў, уцягвае ў працэс пазнання ўсіх студэнтаў. Сістэма апераджальных заданняў дае магчымасць студэнтам спрагназаваць уласны ўзровень сваіх вучэбных дасягненняў і супаставіць іх з крытэрыямі вучэбных патрабаванняў.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова